Анатоль КАЗЮКА

# ЗОРНЫЯ ПЛЁСЫ



Анатоль КАЗЮКА

# ЗОРНЫЯ ПЛЁСЫ

Вершы

Мінск
2002

**Казюка А.**
Зорныя плёсы. Вершы / А. Казюка. 2002. — 80 с.

Анатоль КАЗЮКА нарадзіўся ў 1939 годзе на Барысаўшчыне ў вёсцы Арэшкавічы. Скончыў дзесяцігодку, горнае вучылішча, факультэт журналістыкі Вышэйшай партшколы ў Маскве.

Працаваў шахцёрам у Данбасе, служыў у войску танкістам.

З 1963 года — на Беларускім аўтамабільным заводзе ў Жодзіна: токар, зборшчык, наладчык, канструктар, літсупрацоўнік «Белорусского автозаводца», рэдактар гэтай газеты, начальнік друкарні БелАЗа, партработнік.

Асаблівую ўвагу А. Казюка ў сваёй творчасці надае роднаму краю, яго прыродзе; шчыра, з любоўю піша пра сваіх землякоў, сялян і рабочых, аб чым і сведчаць бадай усе вершы паэта, створаныя як у роднай мове, так і па-расейску.

© Казюка А., 2001

© Мастак Шапашнікава К., 2001





# БЯРОЗА

Без цябе,
журліва-паўнаводнай,
пэўна,
не пражыў бы я і дня.
Стала ты мне
любаю і роднай,
нібыта
бацькоў маіх радня.

Да цябе,
звычайна напрадвесні,
я на крылах
памяці лячу!
Спавіла мяне ты
ў свае песні,
без якіх
і жыць я не хачу.

Тут
дубоў шурпатыя далоні,
бажаволяць ліру
ў добры час.
Ля віроў тваіх
пасуцца коні...
Недзе сярод іх
і мой Пегас.

## НЕЗАБЫЎНАЕ

Дзяўчатам вершаў
я не прысвячаў
нават тады,
калі служыў у войску.
Затое касавіцу
ўспамінаў —
свайго пракоса
першага палоску.
Ішлі дзядзькі
ўнушальнаю брыгадай
ад возера —
да рэчышчаў былых.
І я з касою
трэцім, толькі ззаду, —
з усіх вяскоўцаў
самы малады.
Амаль дзіця,
бязгрэшны васьмікласнік,
якому на пакос
яшчэ не час.
Ды дзед Адам,
брыгадны наш начальнік,
сказаў, што на мяне
глядзіць калгас!..

Салёны пот
вясёлкай засціў вочы,
гарэлі
на далонях мазалі...
І дзед Адам,
да жартаў неахвочы,
казаў мне, каб
не здраджваў я зямлі.
Мне і цяпер
бывае так цікава
згадаць свае
юнацкія гады:
то змірсціцца
пажухлая атава
і ўсцяж па ёй —
ласіныя сляды;
то жаўра праляціць
над жытнім полем,
то — весні крыгалом,
ракі разліў...
Ніколі...
Як відаць, ужо ніколі
не адшукаць таго мне,
што згубіў.

# ЗОРНЫЯ ПЛЁСЫ

Вусцішнаю ліпеньскай спёкай,
калі заміраюць лугі,
нібы са званіцы высокай,
глядзяцца ў раку берагі.

Увечары зорныя плёсы
грабеньчыкам промняў-агнёў
расчэсваюць бакенаў космы
ў кудлатых чубах туманоў.

І пахне прывяленым сенам
яшчэ не разбіты пракос.
І бераг, што гнецца каленам,
густым вербалозам аброс.

Ныраюць у бездань зарніцы
з нябёсаў крутой вышыні,
а месяц за поўняй імчыцца
ў сусвет на гарбатым кані...

І мне тут прадказана лёсам
правесці жыцця карабель
у цішу Бярэзінскіх плёсаў...
Адно каб не сесці на мель.

# ВЕТЭРАН

*К. Коршунаву*

Ён на БелАЗе пачынаў падручным —
яго прыняў рабочы калектыў.
Мелодыяй душы стаў мілагучны
гудкоў заводскіх радасны матыў.

Не зброснеюць тады крыніц вытокі,
калі праз іх цячэ святло надзей...
Ён узышоў на п’едэстал высокі —
і бачны стаў сярод сваіх людзей.

І рады ўсведамляць, што ў хуткаплыні
узнёслых думак не паліў масты...
Ён на жыцця шляху свой след пакінуў,
бо сэрцам — чысты, а душой — святы.

* * *

Бягуць насустрач
рослыя бярозкі —
як ёсць дзяўчаты
ў сарафанах модных.
Адкуль іх столькі
і з якое вёскі,
усмешлівых,
даверліва-лагодных?

А ў далечы —
знаёмыя мне хаты.
Бадай над кожнай
высіцца антэна.
Кружляюць над балотам
бусляняты —
расце і ў птушак
маладая змена.

І вось я — дома.
Сустракае маці...
Яе вачэй азёрных
дабрыня
мяне,
бы колішняе немаўляці,
люляе-гушкае
ў клапотах дня.

* * *

Ліра з Музай
вытканы з трывогі,
з радасці,
журбы і пачуцця
да зямлі бацькоўскай
і дарогі,
апантанай
духам адкрыцця.

Мне сябе
ніяк не перайначыць.
І свой лёс
не перафарбаваць.
Ліру з Музай
нельга прозай значыць —
хоць без прозы
ім не існаваць.

Фарбы з часам
выцвітуць дарэшты.
Зменяцца
каштоўнасці жыцця...
Не апошні я,
як і не першы,
з песняй матчынай
вярнуўся з небыцця.

# ЗОРКІ

Згасае
з гадамі сэрца —
людзі, як зоркі,
гінуць.
Святло,
што яны пакінуць,
тысячагоддзямі льецца.

Магчыма,
якраз за гэта
зоркамі нас
называюць...
Зоркі
не паміраюць,
зніклыя ў цемры сусвету.

* * *

Прыпынілася
воблака белае
ў чаканні расы
вечаровай...
Ах, якія былі
мы нясмелыя
ў ціхай завадзі
верасовай!

І маўчала
сасна адзінокая
з яркім праблескам
голак-ігліц.
І спяшаўся
ў неба высокае
летні дзень
пажарам суніц...

Калі ноч дагарэла
зарніцамі,
сплыў туман
у надрэчны аблог, —
мы абодва
так пахлі суніцамі,
што нам, пэўна,
зайздросціў
сам Бог.

* * *

Дзіўна,
успаміны мае сталі
шэптам траў
і гоманам дуброў,
роснай сенажаццю
ў звоне сталі —
рокатам «БелАЗаў»
і «Зуброў»,
посвістам
забытых паравозаў,
хвалямі Дняпра,
Беразіны,
кучарамі
прыазёрных лозаў...
Помнікамі —
сведкамі вайны.



# САКАВІК

У начной
марознай цішыні
правады гудуць
наўздзіў трывожна.
Сакавік гарцуе
пераможна
на сівым,
у яблыках,
кані.

Завіруха
вые,
слёзна плача
на грудзях
разбуджанай Зямлі...
Плямісты скакун
алюрам скача
праз абшары лесу
і палі.

# ДЗЯЦІНСТВА

### *1*

Век жыцця,
як поры года,
пачынаецца
з вясны.
А вясна сваім
прыходам
абуджае
нашы сны.

Хмарка сыдзе
напрадвесні,
нібы сум
у небыццё.
І дзяцінства
змоўкне песня:
станецца яна —
жыццём.

У кудзелю
боль саўецца,
на пячы
будзе драмаць...
Нам дзяцінства
і даецца,

каб было што
ўспамінаць.

**2**

Маё дзяцінства
ў слязах купалася.
У смяротным агні
спавівалася.

Майму дзяцінству
трывожна спалася —
яно, гаротнае,
ваенным сталася.

З бацькоўскай ласкай
зусім не зналася —
да крыжа магільнага
прытулялася.

Маё дзяцінства
не абарвалася,
хоць вайною
і руйнавалася.

Не паўтаралася
каб аніколі
майго дзяцінства
ліхая доля.

## СВЯТА ПТУШАК

Вясну да нас прыносяць Саракі —
зямное свята пералётных птушак.
І сонца прыгажэе ад вяснушак,
і ў небе песні ладзяць жаўрукі.

Мяне матуля ў першы весні дзень,
што з раніцы ўстае за Саракамі,
чакала ў летуценнях з жаўрукамі —
і не патух яе надзей прамень.

У снах з таго і лётаю, відаць,
і сэрца жвавым птушанём трапеча...
Запоўніла душу маю сінеча,
з якое сталі зоркі выплываць.

# ПАВОДКА

Беразіна
разлеглася шырока,
разбэрсвае балот
сівы каўтун.
Ужо нябачна
Зоніна Затока,
схаваўся з галавой
у вір Баўтун.

Адно пагорак —
той, што Навасельскі,
брыдзе на Вылазы
ў надзейны схоў.
Прыціх Барсук,
нібы фарпост армейскі,
які ад Клешчання
нябачны з-за кустоў.

Чароды качак —
скрозь па Малым Бродзе,
а Даражылаўка
ад нерасту кіпіць...
Паводка
дапаможа і нашкодзіць,
прымусіць
і забыць, і палюбіць.

## ЛЕТНЯЕ

Заклубіўся туман
ля Каніськай Гары,
лезе цераз паркан
ранак летні ў двары.

Толькі гэткай парой —
ані мараў, ні дум...
Спіць Сяло пад гарой.
За гарой — Самадум.

Алісееўка спіць,
бы прадаўшы пяньку...
А світанак бяжыць,
як пажар па каньку.

Цішыня аж гудзе.
Ветрык — лебедзя пух...
Нібы ў казку, брыдзе
на радоўку пастух.



* * *

Кнігаўка
над полем лямантуе —
мне душу,
свавольная, бунтуе.

— Што з табою?..
Ці не зычыш ты
мне з жыццём
расстацца халастым?

Ты суйміся, птушка,
не скуголь —
не пагас маіх
пакутаў боль.

Не астылі
жарсці вугалі...
Мы паразумецца
не змаглі.

Нашых сэрцаў
гулкі разнабой
раздзяліў нас
ка́меннай сцяной.

# КАПЕЙКА

У пойме, як вока
з-пад рыжага вейка,
глядзіцца затока
пад назвай Капейка.
З вясны тут — па вушы,
а летам — па лыткі...
Гарланяць квакушы,
бы ўсе на падпітку.
Ім блізка да згубы —
адсюль і трывога:
бусліныя дзюбы,
што восці-двурогі.

З азёрнага боку
зірнеш на Капейку —
плюскоча ў затоку
вада, нібы ў лейку.
А ў возера скачуць
з-пад гаткі крыніцы.
Смяюцца і плачуць
дажджом навальніцы.
І гэтак, здаецца,
было, ёсць і будзе:
калі недзе льецца,
дык недзе — прыбудзе.

# ПРАВЕДНЫЯ СНЫ

Праведныя сны —
кажуць мне яны:
не шукай кахання пад вярбой —
будзеш гараваць,
будзеш сумаваць,
як вярба, спавітая журбой.

З веснае пары
сталі вечары
марамі няздзейсненых надзей,
бо перад вярбой
след згубіўся твой...
Дзе шукаць маё каханне, дзе?..

Палі халады
на крышталь вады:
боль і сум — на шчасце варажба.
І ў журбе сваёй
я жыву табой...
Плача па-над рэчкаю вярба.

* * *

Не чакай мяне
на скрыжаванні.
Кветак
гэтаксама не чакай...
Мары,
летуценні,
спадзяванні
зачарніў
адчаю небакрай.

Салаўі нашы
даўно ахрыплі,
маладзік
дапіў зару з каўша...
Сэрца
ажыло
і мукі зніклі —
з выселкаў
вярнулася душа.



# АСЕННЯЕ

Чорных хмар валатоўкі
ўсцяж па небе ляглі.
Восень шые абноўкі
й сцеле скрозь па раллі.

Спрэс бульбяныя гоні
закурэлі дымком.
Зольны дождж непакоіць
шэрапёрых шпакоў.

Асакі збіты поплаў
туманамі прамок.
Дзень усё яшчэ цёплы,
а ў начы — халадок.

Неба хмарамі стыне.
Росаў зорыцца бель.
Золатам на рабіне —
мяккая акварэль.

# ВЯЛІКАЯ СУБОТА

Гайдаецца вечар
вясновы над вёскай —
да неба прывязаны
шэрай палоскай.

Заранка гарыць,
як царкоўная свечка.
І сонца садзіцца
чырвоным яечкам.

Дымяць каміны
па-над кожнай хацінай —
вісіць у паветры
пах здобы з вяндлінай.

Кіпіць і сквірчыць —
задыхаюцца печы...
Падобны на раніцу
стомлены вечар.

Рыхтуецца вёска на дзень,
бы на тыдзень:
сягоння субота,
а заўтра — Вялікдзень.

# РАДАНІЦА

У россыпе магіл
былое поле
акрэслена мяжой ля бальшака...
Тут спачывае тых
зямная доля,
чыя ў пясок сплыла жыцця рака.
З маіх аднавяскоўцаў —
не іначай! —
быў кожны незвычайны чалавек.
Толькі цяпер я
ў роспачы адзначыў
наколькі іх кароткі стаўся век.
На бацькаўшчыне
лепей адчуваеш
сучаснасць, падуладную вякам:
і з прашчурамі
ў марах пабываеш,
і аддасі павагу землякам,
якія ўжо даўно
сталі святымі,
у святасці сваёй спакой знайшлі...
Мы сёння
ўспамінаем іх такімі,
якімі яны ў вечнасць адышлі.

# КАЛЯДЫ

Памятаю, як пад Каляды маці
рыхтавалася да гэтага свята:
так яна прыбярэ ўсё ў хаце —
глядзіш, — бы не наша хата.

А калі хлеб дастане з печы
ды зверху вадой акоціць:
дыхаць у хаце, здаецца, нечым,
сохне ад хлебнай смагі ў роце.

Потым сала шматок з кладоўкі
ўнясе і скажа няўзнак нібыта:
«З такое, як сёлета, галадоўкі
асілкамі станеце, ненасыты!..»

Тым часам у печы куцця пыхцела —
духмяніла смачным хата...
Моўчкі, з надзеяй на нас глядзела
партрэтам бацькоўскім свята.

# ЖУРАЎЛІНЫ КРАЙ...

Няма
ўжо тых бяроз
на роднай старане,
з якімі побач рос
і наяве, і ў сне.
Сустрэла не радня,
а боль і цішыня
маўклівым успамінам
аб вайне.

Кранулі
сэрца зноў
суровыя гады,
як грозны час павёў
у вечнасць маладых.
І не лісты ад іх
прыносяць жураўлі,
а рэквіем жалобы
для жывых.

Сівы,
дрымучы бор
зусім ужо не той.
Згібеў бацькоўскі двор,
што стаўся сіратой.

І толькі
жураўлі
над вёскай праплылі
жывой легендай памяці
святой.

Бацькоў
маіх зямля
ўся ў родзімках магіл.
Сыду аднойчы я,
пакуль хапае сіл,
у сонечную даль,
дзе жураўліны край
трымае на далонях
небасхіл.



# РОДНАЯ ВЁСКА

Змянілася
не ўсё ў тваім абліччы —
была такой жа, вёска,
і раней...
Толькі цяпер ужо
праз Шавярнічы
арэшкаўцы
не ездзяць, як даўней.

Пралёг асфальт
па Змітраўскай дарозе:
аўтобусам —
не круг дзесятак вёрст.
І вось —
я на сваім стаю парозе...
З кім раздзяліць
сустрэчы нашай тост?

Маўчыш...
Маўчу і я, бы вінаваты,
але ў маўчанні чую
родны звон.
І грэе
мне далоні гонкі клён
былым цяплом
старой бацькоўскай хаты.

# АБ ЧАСЕ

Мінулае б закрэсліў
сквапны цынік
і на гісторыю
навёў бы зману цень...
Ды і наўмысна
спынены гадзіннік
дакладны час пакажа
двойчы ў дзень.

* * *

Ранішнія росы,
нібы слёзы,
выплакаў на досвітку
туман.
Заспявалі
белыя бярозы
і зайграла даль,
нібы арган.

Родная зямля,
ты падарыла
мне на непаўторнае
жыццё
песню хараства,
любоў і крылы,
і надзеі
светлай пачуццё.

Будуць і спатканні,
і расстанні.
На рамонку будуць
варажыць.
І пакуль ёсць песня
і каханне —
будзе прыгажосць
на свеце жыць.

* * *

Галасы дзявочыя над лугам
песней з-пад Ражэчнага плывуць,
а касцы замашна мерным цугам
да ракі па Вылазах ідуць.

І галосіць рэха ля дубравы
сіплай вастрынёй сталёвых кос,
і кладуцца скошаныя травы
на расой заплаканы пракос.



## ПЕСНЯ

Кужалем туман
вісне над ракой,
травы п’юць
сцюдзёную расу...
Ранак над сялом
сонечнай рукой
расчасаў ружовую касу —
салаўінай раніцы красу.

Мы з табою ў ёй
заблудзіліся,
як лічылі
сполахі зарніц...
Не згубілі мы,
не забыліся
любых сэрцу сцежак і крыніц...
Ціхіх зор і звонкіх навальніц.

Апынуцца б нам
не ў апошні раз
у абдымках
ветлівых дуброў...
Дзе блукалі мы,
там гукаюць нас
галасы сяброўак і сяброў...
Сэрцаў нашых вернасць і любоў.

* * *

Адляцелі лебедзі,
змоўк птушыны хор.
Халадоў наперадзе
ледзяны віхор.

Стынуць пад аблокамі
слотныя дажджы.
Знобкія, за вокнамі
плачуць капяжы.

Лістапад віхурыцца
над сцяжынай той,
дзе даўно не чуецца
любы голас твой.



# ЛЕГЕНДА ПРА СВЯТЛО

Калі сонца нікне ў вечар сонны,
прамянёў яго нясе выток —
безупынны, спеўна-манатонны —
правадамі ў ноч электраток.

Як Хрыстос, карысліва распяты,
ён струменіць з мук сваіх жыццё —
і святлеюць вочы кожнай хаты,
цемра адступае ў небыццё.



# ДРАНІКІ

Смажаныя дранікі ў смятане —
як жыцця вясковага ўспамін:
раннім досвіткам матуля ўстане
і пячэ, пячэ за блінам блін.

Да мяне, у ложак, цеплынёю
зманліва крадзецца печы жар —
і я ў сне лунаю над зямлёю,
і мне сонца грэе рукі й твар...

На абрусе горкаю на ўслонцы —
печыва смачнечы незямной! —
дранікі, падобныя на сонцы,
ярка ззялі тукавай расой.

У глячку смятану, як світанне,
сонечны праменьчык саграваў...
Дранікаў смачней з таго снядання
ў гарадскім жыцці не каштаваў.

## ПРЫСТАНЬ «ЖУКАВЕЦ»

Сляпы
старэнькі параход
у сподцах белых акуляраў
то набіраў,
то сцішваў ход,
дыміў трубой ажно да хмараў.

Нібы падцяты сом,
хадзіў —
плытоў грабёнку
зрушыць рваўся,
паміж бярвеннямі блудзіў
і ў гуле прыстані губляўся.

Выпрабаваннем лесасплаў
і людзям быў,
і параходам,
ды колькі радасці даслаў
будоўлям,
шахтам і заводам!

Цяпер такога ўжо няма —
таму ўспамінаў
цэлы шэраг,
і памяць просіцца сама

ступіць нагой
на гэты бераг.

Калісьці тут вось,
ля ракі,
на лесасплаве жукавецкім,
вайну сустрэўшы,
юнакі
вялі баі ў тылу нямецкім.

У прорву падалі масты,
ляцелі ў бездань
паравозы...
А мсціўцаў лес хаваў густы,
што ўсцяж разлёгся
паўз Бярозу.

Тут шмат што згублена
вайной —
шалелі ў злосці супастаты...
Тут бацька расстраляны мой
за тры вярсты
ад роднай хаты.

# ЦІШЫНЯ

Стынуць зоркі ўначы,
цішыня — хоць крычы.
Нібы вязень, адзін
я ля шыбаў-ільдзін.

Цішыня, не маўчы —
ты мой сум залячы.

Неслух ветах даўно
не шкрабецца ў акно,
бо ў яго маладзік
выкраў рогі і знік.

Цішыня, не маўчы —
ты мой страх залячы.

Зорнай ночы канвой
не цікавіцца мной...
Маіх мар вышыня,
што для шыі пятля.

Цішыня, не маўчы —
ты мой боль залячы.

# ЗОЛАТА БЕРАНДЗЕЯ

Голле паўсюль,
размаітае,
сцята марозным гуззём,
жухлай лістотай
пакрытае,
нібыта зрэбным рыззём.

Восень
зграбае золата
ў куфэркі мар і надзей...
На ўзлессі
пад дубам-волатам
зімуе ў лісцы Берандзей.



* * *

За ракою травы пахлі мёдам,
ліпень у палетках даспяваў,
дуб у мройнай засені цянётаў
ад спякоты жалуды хаваў.

Нашага кахання адгалоскі
салаўіны пошчак заглушаў,
і начою рэха па-над вёскай,
лётала, як соннага душа.

Дні за днямі ў вечнасць адплывалі,
чэзлі ў небе хмаркамі гады...
Дзе сустрэч мы некалі шукалі,
сёння там паснулі халады.

# НАРАДЖЭННЕ ВОЛАТА

*1*

Пнеўмакран хрыпіць
паветрам спёртым
і скуголіць
голасам нязлым —
прымацоўваюць
да рамы гайкавёрты
розныя дэталі
ды вузлы.

Дзе-нідзе
злятае долу стружка;
ёсць пярэдні —
ёсць і задні мост!..
Спакваля
канвеерная стужка
на апошні
рухаецца пост.

І каб волат
лёгка мог адольваць
горных
віракрутаў серпанцін,
тут яго праверацьі
і на кволасць,

і на дужасць
яго конскіх сіл.

***2***

«БелАЗ»
трывушчаю істотай
сышоў
з канвеернай дугі —
і ўжо на першым павароце
міргнуў чырвоным
раз-другі.
Ён
ціха сунуўся на волю
праз зеўру стартавых варот...
Пакінуў волат
свой завод
і пакаціў
шукацьме долю.
Агульнага
ў мяне з ім многа,
ды браць адно трэба ў разлік:
я, чалавек,—
любімец Бога;
ён —
мой любімец, грузавік.

# ДАКОР...

Няшмат я напісаў —
і менш надрукаваў,
бо кволай музе сам
прытулку не даваў.

І з матчыных я слоў
склаў прыказку адну:
лепш жменька каласкоў,
чым поле бур'яну.

Рыпела без мяне
жыцця майго пяро:
дзе — смыкам па струне,
а дзе і... тапаром.

Не размалёўваў я
венецыянскіх ваз...
Як песня салаўя —
мне родным стаў БелАЗ.

Завод — і мой дакор,
мой хлеб, і мая соль,
аковы і прастор,
мая любоў і боль!

# КУПАЛЬНАЕ

***1***

Крутабокімі рамонкамі
між агнёў вянкі гайдаліся,
жаўцізной рабіны гронкамі
фарбы ліпеня ўсміхаліся.

Пад вярбою лёсу чарамі
нас вянчала ноч купальная,
ды надзеі нашы з марамі
раз’яднала зорка ранняя.

Узышла яна, світальная,
морак ночы ў рэчку скінула
і, як песня развітальная,
летуценні нам пакінула.

***2***

Выбег золак залаты
пад галін вярбовых шаты —
і панёс усход крылаты
чары сонечнай фаты.

Заспявалі чараты
прывітальную світанню...

Нам дарыла ноч спатканне,
а каханне — я і ты.

Ранкам ніцая вярба
ў росах траў палошча косы...
Тут — прызнання нашы слёзы,
мроі мараў і журба.

Не згубіць і не знайсці
радасць светлага кахання,
не вярнуць таго спаткання,
што пайшло, каб не прыйсці.

Адцвіла — і ў небыцці
кветка-папараць заснула,
а каханне сэрцам чула,
што яму яшчэ цвісці.

Будзе ранак залаты
і купалля звон над намі...
Будзе зноў каханне з намі —
веру я, павер і ты.



# ВАСІЛЁК

Сонечную кветку
зорнай плыні
пазнаю між іншымі
здалёк,
бо яна —
мой край самотна-сіні —
самы родны ў свеце васілёк.

Грэх было б яго мне
не прыкмеціць
на жыццёвай лесвіцы
дарог:
ён душу мне саграе
і свеціць
у хвіліны смутку і трывог.

І калі далёка
ад Радзімы
біўся ў сонме мрояў
матылёк, —
бачыў я азёрны
край любімы
і ў жытнёвым полі васілёк.

# ЗВОН ДАБРЫНІ

Смалісты звон
вясковай хаты —
мая адвечная любоў,
і подых радасці
крылатай,
і песня ўзнёслая без слоў.

З ім парадніўся я
з маленства
і невядома ад чаго
пакінуў шмат
у думках месца
для светлай памяці яго.

Звініць ён
баравой сасною
і вабіць хатняй цеплынёй,
духмянай
парай сырадою,
багатай хлебнаю зямлёй.

# НА БУДОЎЛІ

Дзе вятры панавалі
і пустэча была,
гмахі ў шэрагі сталі
з пліт, бетону і шкла.

Ад стараннае працы
наваселлі наўкол...
Не пустуюць палацы,
карпусы новых школ.

Ранкам сіберна-веснім —
вось ён, радасці лёс! —
кранаўшчык з паднябесся
дзецям сонца прынёс.

## НЕ ЗГІНУ Я...

Навошта ты мяне
пакінула так рана,
дзяцінства басаногае маё?..
Глядзіцца ў памяці,
як хроніка з экрана,
імгненне мімалётнае тваё.
Там бацька мой —
жывы, не расстраляны,
і маці не хаваецца ў бары,
гестапаўцамі
дзед не катаваны,
бабуля не галосіць на двары.
Аплаканыя мной,
мае дзве родных цёткі
не высланы ў Нямеччыну на здзек,
старэйшы брат
яшчэ не зведаў плёткі...
Што і казаць, мінуў крывавы век —
бярэцца ў сілу
фактар чалавечы...
І як ні склаўся б мой далейшы лёс, —
не згіну я
ў нястачы ды галечы —
даволі гора і пякучых слёз!

# ВЯСНУШКІ

Зноў да нас з замор'я
прыляцелі птушкі,
песнямі вясельнымі
абудзілі сны...
У цябе на твары
ўспыхнулі вяснушкі —
сведкі прыгажосці,
сонца і вясны.

І цяпер табою,
маладой і пекнай,
буду любавацца
я і ў дзень, і ў ноч:
мне твае вяснушкі,
бы жарынкі з пекла,
дзе гарыць грахоўна
ўчараваны корч.

Мне карчом рагатым
хтось душу скародзіць —
сэрца маё паліць
тых жарынак рой...
Ды каханню нашаму
анішто не шкодзіць:
сны мае і мары
поўняцца табой.

* * *

Накукавала мне зязюля
жыцця нядоўгія гады,
таму і раіла бабуля
агню баяцца і вады.

А я і ў вір не раз кідаўся,
пажар маланкавы тушыў —
жыццё як след спазнаць стараўся...
І забабоны перажыў.

Не браў, ані, з чужой скарбонкі
пабочных сіл і гучных спраў:
гартаў, як мог, жыцця старонкі,
было, што сёе-тое рваў.

І сёння цяжка мне даецца —
хоць бы і гэты, новы верш...
Жыццё тады жыццём завецца,
калі яму ўсё аддаеш!

# ВЯСНА Ў БАРАЎЛЯНАХ

*«Усе дзеці зямлі — нашы дзеці!» — так сцвярджаў аўстрыйскі гуманіст Герман Гмайнер, чалавек мінулага стагоддзя, аўтар гуманнай ідэі выхавання сірот. У аснове гэтай ідэі — захаванне сямейных прынцыпаў. Пабудаваная ў 1995 годзе ў Бараўлянах вёска (SOS-Кіндэрдорф) была па ліку ўжо 343-я. І ўсе гэтыя Дзіцячыя вёскі носяць імя Германа Гмайнера, які памёр 26 красавіка 1986 года ў Мюнхене, дзе застаўся яго фонд, што ўвесь час папаўняецца шляхам ахвяраванняў. Філіял фонду ёсць і ў «Мінск-Комплекс-Банку».*

*Выхаванец і паслядоўнік Г. Гмайнера Хельмут Куцін плануе пабудаваць у Беларусі яшчэ адну такую вёску.*

Як нашы дні лічыць пакіне таймер,
тады прадоўжаць справы век жыцця...
У нашы Бараўляны Герман Гмайнер,
нібы вясна, прыходзіць з небыцця.

Цудоўны чалавек, што ў Альбершвендзе,
магчыма, слыў апошнім дзіваком —
аддаў сябе ўсяго служэнню дзецям,
бо зведаў сам сіроцтва хлапчуком.

Свядомы крок да ведаў медыцыны
зрабіў ужо ў юначыя гады,
ды практыку ўрачэбную пакінуў,
бо іншым захапляўся ён тады.

Знаёмы быў і з Матушкай Тэрэзай,
Індзірай Гандзі, Ламаю Далай...
І стала думкаю галоўнай тэза:
стварыць сіротам хоць маленькі рай!

Вялікі гуманіст свайго стагоддзя
лічыў — падтрымку меў з боку сяброў, —
што для сірот спрыяльным асяроддзем
ёсць дом, сям’я і... матчына любоў.

І вось — ужо на кожным кантыненце
пабудаваны вёскі для дзяцей...
Вялікі Герман Гмайнер з Альбершвендзе
пакінуў нам святло сваіх надзей.

* * *

Двум берагам
нідзе няма спаткання...
Ах, бераг твой чаруе мне душу —
і я табе лісты штодзень пішу
з надзеяй
на ўзаемнае каханне.

Флатыліі маёй
не заўважаеш —
караблікі плывуць у далячынь...
Ну як перапыніць мне твой спачын?
Калі маё пасланне
прачытаеш?

І сёння зноў
ад самага світання
вяслом надзей настойліва грабе
маё нецалаванае каханне —
самотнае,
змарнелае ў журбе.



# МАЛОЕ ПАЛЕССЕ

Як толькі я
за Чэрнеўку заеду
і скончыцца
Барысаўскі раён —
трапляю ў лес,
нібы ў абдымкі дзеда,
бо гэты лес
садзіў калісьці ён.

Бяжыць той лес
ажно пад Шавярнічы
й да Змітравіч
абапал бальшака...
Тут дзеда ведаў
кожны паляўнічы,
як першага
ў акрузе лесніка.

Збіраў ён шышкі,
лушчыў іх вясною
і зерне
ў гадавальніку садзіў...
Я рос без бацькі —
дзед мяне з сабою,
як помню, летам
часта ў лес вадзіў.

Аднойчы нам
далася ў знакі слота,
дзед спачуваў мне,
хвалячы абход:
Малым Палессем
ён назваў балота,
калі міналі
Клюжанаўскі брод.

Прайшлі гады...
Я кніжак начытаўся.
І нават на Палессі
пабываў,
ды толькі з кім бы там
ні сустракаўся, —
ніхто мой край
палесскім не назваў.

А насамрэч —
праз брод, што Перавесцем
арэшкаўцы завуць
даўным-даўно,
ля Клюжанкі,
так званае Палессе,
ідзе з-пад Крупак —
на Беразіно!

Бязмежная
балотная прастора,
што ў купінах дурніц
ды журавін,
была калісьці
возерам ці морам,
ці водным шляхам
з казачных Афін.

Круцілі тут лазу
і дралі лыкі,
з карчоў смаляных
гналі шкіпінар...
Палессе хоць Малое,
ды вялікі
сабраны ў ім жыцця
патэнцыял.

Баброў тут сем'і
ў багне непраходнай
жывуць, бяспечныя,
спакон вякоў,
а побач з імі
ў дзебры прыбалотнай
стае ласёў, казуляў
і дзікоў.

Сюды з-пад Гумнаў,
Выдрыцы ці Ўхвалы
прыб’ецца часам
стомлены грыбнік,
бо тут — не дзіўна —
рэха і бывалых
закруціць так,
што лішнім будзе крык.

Вось і мяне
Палессе заманіла,
хаця мой дзед
назваў яго Малым, —
яно і сёння
прыдае мне сілы,
і мне яно —
як бацькаўшчыны дым.

Прыціх пейзаж —
ні матылёў, ні птушак,
вятры паснулі
ў сонечнай цішы...
Пад лётны пошум
быстрых легкавушак,
я шлёпаю
па Змітраўскай шашы.

# І ЛЮБОЎ МАЯ, І ЖУРБА...

Не дзеля размоў
і прыгожых слоў:
мне Радзіма — песня і любоў...
Без яе — не пець,
без яе — не жыць,
мне яе ніколі не забыць!

Дзе б я ні бываў,
дзе б ні вандраваў —
я свой родны кут не забываў:
дзе́ўчыну кахаў,
Беларусь любіў...
І пачуццяў гэтых не згубіў.

Хто з іх прыгажэй?
Хто з іх даражэй?
Да якой сцяжына найдаўжэй?..
Нельга адказаць,
бо не параўнаць
тое, што ў жыцці не разарваць.

Русая мая!
Белая мая!
З імі я — адзіная сям'я!
І любоў мая,
і журба мая —
родны край мой, Беларусь мая!

* * *

*Сыну*

У пэўным сэнсе —
песня мая спета.
Далейшае
залежыць ад цябе...
Мне хочацца,
каб ты жыцця куплеты
складаў бы сам,
чытаць бо іх — табе...

Ёсць у жыцці падзенні,
ёсць і ўзлёты,
руплівасць дзён,
бяссонніца начэй...
Калі гнятуць
жыццёвыя турботы,
з уласнай песняй
дыхаеш лягчэй!

# УСМЕШКА

*Жонцы*

Ты радуешся
сонейку вясноваму,
якое песціць
промнямі зямлю...
І нават усміхаешся
па-новаму,
за што цябе
яшчэ мацней люблю.

Сваёй усмешкай
сонечна-агністаю
мяне вярнула ты
ў юначы сон,
дзе душы нашы,
светлыя і чыстыя,
кружылі ў небе
пад кахання звон.

* * *

Вечар быў той марозны,
зябка зоркі мігцелі...
Мы надзіва сур'ёзна
вочы ў вочы глядзелі.

Мне твае — абяцалі
пацалункаў багата.
А мае — запрашалі
ў сэрцаў спеўнае свята.

Усё здзеялі чары:
закахаўся ў цябе я...
Месяц выплыў з-за хмары,
ды не сціхла завея.

Каб не так было снежна
і мароз збег упрочкі,
мы наўрад ці бязгрэшна
пражылі б тую ночку.

# НАВАЛЬНІЦА

Вецер гнуў
кудлатую вярбіну,
пад якую
дождж нас затурыў;
човен наш
бадай што праз хвіліну
пад вадой
у кругаверці быў.

Бліскавіца
гойсала па небе,
грукатаў
за хмарамі Пярун...
Гэта хто ж
і па якой патрэбе
трапатуху грае
ў столькі струн?

Праз сумоўе
нашага маўчання —
пад дажджу
віхурны перапляс
кралася

русалкаю каханне,
каб у вір пачуццяў
кінуць нас.

У грудзях
надзей агеньчык біўся,
цешыў сэрцы нашыя
і грэў...
Дождж ушчук —
нарэшце ўгаманіўся! —
дый Пярун суняўся,
не грымеў.

# АБУДЖЭННЕ

Нябёсаў скляпенне чарнела
над стрэламі вежавых кранаў.
Абломанай, поўня вісела
на шэра-блакітным экране.

На схіле між зорных праталін
сунічна ірдзела світанне...
Мы першымі сонца віталі —
яно нам свяціла каханнем!



# БУСЛЫ НАД БАРАЎЛЯНАМІ

*В. Міхалевічу**

З надзеяй углядалася
будоўля ў неба кранамі,
пакуль не дачакалася
буслоў над Бараўлянамі!

Вясёлыя, шчаслівыя
гуляюць дзеці з мамамі.
Руплівыя, імклівыя —
буслы над Бараўлянамі.

Павер'е не падманвае —
упэўніліся людзі:
дзяцей у Бараўлянах
бусліны клёкат будзіць.

Гады, як хвалі стромыя,
гайдаюць памяць марамі...
Бы ветразі, — нястомныя
буслы над Бараўлянамі.

---

* В.М. Міхалевіч узначальвае «SOS-Кіндэрдорф імя Г.Гмайнера».

# З РУСКАМОЎНАГА СШЫТКА



* * *

*Эдуарду Щирому*

Вспомнился
первый наш вальс —
послевоенный,
старый.
Встретил
оркестром нас,
гордо презрев гитару.

Вспомнился
ветхий мост,
названный
танцплощадкой.
Сколько там
местных звезд
ты покорил трехрядкой!

Море
счастливых глаз —
встречи,
цветы, улыбки...
С нами
влюблялся вальс,
наши прощал ошибки.

* * *

Разбудила меня
голубая капель.
Стала даль
до небес ясна...
Музы легкую грусть
в соловьиную трель
обратила
колдунья весна.



* * *

Юности нашей березки
стали взрослей.
Дымкой весенней сережки
виснут с ветвей.

Те же тропинки и стежки.
Те же цветы.
И на знакомой дорожке —
вновь я и ты.

Только судьбу не исправить.
Не изменить.
В юность себя не отправить.
Не возвратить.

Ты позови, как когда-то.
Ты позови.
Это весна виновата
в нашей любви.

Снова меня на рассвете
будят мечты.
Как хорошо, что на свете
где-то есть ты.

# РОЗОВЫЕ ЧЕЛНЫ

В розовом челне
ветер плыл рекою,
уронив закат
в легкую волну.
Близкий берег твой
розовой мечтою
поманил меня
в новую весну.

В розовых лугах
тихо стынет вечер.
Под веслом моим
плещется река.
В розовом челне
я спешу на встречу,
но река любви
слишком широка.

В розовом челне
розовым рассветом
унесет весна
розовые сны...
Тропы наших встреч
заплутались где-то
в розовых мечтах
розовой весны.

# ГРЕЗЫ

Заярился
черемухи цвет,
в юность нас
зазывая...
Соберу
для тебя в букет
грезы мая.

Мы войдем
в утра раннего свет,
тишину
обнимая,
первый наш
соловьиный рассвет
вспоминая.

Цвет черемухи белый,
как снег,
но не тает...
Не тает.
Только сад,
затаивший твой смех,
заметает.

# ПЯТАЯ ШКОЛА

Две юных березки в окошко глядятся,
покинув романтикам трель соловья...
Они мне, как юность ушедшая, снятся.
И пятая школа моя.

Я им не оставил сердечных признаний,
на долгие годы любовь затая.
Они остаются мне памятью знаний.
И пятая школа моя.

Здесь нас окрыляли заветные грезы.
Надежда звала в неземные края.
А сердце незримо пленили березы.
И пятая школа моя.

Настроится память на будни седые,
на светлую грусть, о былом не тая, —
я снова вернусь к вам, березки родные
и пятая школа моя!

# ЗЕМЛЯКИ

Рассудить сможет разве что Бог,
если друг не подаст мне руки...
Вспомню, что есть отцовский порог,
где остались друзья-земляки.

Не обидят и не предадут —
от измены они далеки.
А споткнешься — на помощь придут,
ведь на то они и земляки!..

Если жизнь преподаст мне урок
начать все с неизвестной строки —
вспомню старый отцовский порог,
где и я наречен в земляки.

# Замест пасляслоўя

Паэты, калі не пасланцы Божыя, то, прынамсі, сыходзяць з неба на зямлю з Яго бласлаўлення. І таму іх самыя палкія пачуцці й самыя смелыя крозы ўвасабляюцца ў зорках. Відаць, адсюль і падабенства лёсаў: промні зніклай зоркі дасягаюць зямлі й доўга цепляць у чалавеку надзею на шчасце, акурат як і святло шчырых радкоў паэта стагоддзямі нясе ў сабе першаплынь радасці, існы выток адкрыццяў.

Аўтару, майму земляку, пашчасціла — ён сцвердзіў сябе як паэт няхай пакуль і адзіным, але такім жаданым для нас, яго чытачоў, промнем-зборнікам вершаў. Светлым промнем, сонечным. Не зважаючы на захмаранасць лёсу партыйнай схаластыкай, жыццёвымі нягодамі, паэтычны радок Анатоля Казюкі не ўвабраў суму і роспачы. Ён, светлы, поўніцца любасцю да родных мясцін, людзей, каханай.

Прыроду нельга апісаць лепей, чым яна ёсць на самай справе. Затое праз узнёсла-шчырае, вобразнае слова можна наўздзіў горача прасякнуцца да яе пачуццём любові. Пяро-крэсіва, здольнае выкрасаць такое пачуццё, мусіць належаць таленавітаму паэту. Як бачым, талент у аўтара «Зорных плёсаў» ёсць, а гэта якраз і сведчыць аб тым, што зоркавы лёс, хоць і не маладога ўжо, але па-ранейшаму неўтаймоўнага рамантыка Анатоля Казюкі стане яшчэ болей шчаслівым і плённым.

Адам ВЫГОДСКІ,
пісьменнік

# Змест


*Бяроза* ........................................ *4*
*Незабыўнае* ........................................ *5*
*Зорныя плёсы* ........................................ *7*
*Ветэран* ........................................ *8*
** * * Бягуць насустрач рослыя бярозкі...* ........................................ *9*
** * * Ліра з Музай...* ........................................ *10*
*Зоркі* ........................................ *11*
** * * Прыпынілася воблака белае...* ........................................ *12*
** * * Дзіўна...* ........................................ *13*
*Сакавік* ........................................ *14*
*Дзяцінства* ........................................ *15*
*Свята птушак* ........................................ *17*
*Паводка* ........................................ *18*
*Летняе* ........................................ *19*
** * * Кнігаўка над полем лямантуе...* ........................................ *20*
*Капейка* ........................................ *21*
*Праведныя сны* ........................................ *22*
** * * Не чакай мяне...* ........................................ *23*
*Асенняе* ........................................ *24*
*Вялікая субота* ........................................ *25*
*Раданіца* ........................................ *26*
*Каляды* ........................................ *27*
*Жураўліны край...* ........................................ *28*
*Родная вёска* ........................................ *30*
*Аб часе* ........................................ *31*
** * * Ранішнія росы...* ........................................ *32*
** * * Галасы дзявочыя над лугам...* ........................................ *33*
*Песня* ........................................ *34*
** * * Адляцелі лебедзі...* ........................................ *35*
*Легенда пра святло* ........................................ *36*
*Дранікі* ........................................ *37*
*Прыстань «Жукавец»* ........................................ *38*
*Цішыня* ........................................ *40*
*Золата Берандзея* ........................................ *41*

** * * За ракою травы пахлі мёдам...* 42
*Нараджэнне волата* 43
*Дакор...* 45
*Купальнае* 46
*Васілёк* 48
*Звон дабрыні* 49
*На будоўлі* 50
*Не згіну я...* 51
*Вяснушкі* 52
** * * Накукавала мне зязюля...* 53
*Вясна ў Бараўлянах* 54
** * * Двум берагам...* 56
*Малое Палессе* 57
*І любоў мая, і журба...* 61
** * * У пэўным сэнсе...* 62
*Усмешка* 63
** * * Вечар быў той марозны...* 64
*Навальніца* 65
*Абуджэнне* 67
*Буслы над Бараўлянамі* 68

***З рускамоўнага сшытка***

** * * Вспомнился...* 70
** * * Разбудила меня...* 71
** * * Юности нашей березки...* 72
*Розовые челны* 73
*Грезы* 74
*Пятая школа* 75
*Земляки* 76

*Замест пасляслоўя* 77

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Казюка Анатоль Паўлавіч

Зорныя плёсы
Вершы

Адказны за выпуск *А. Аношка*

Рэдактар *А. Масарэнка*
Мастак *К. Шапашнікава*
Карэктар *Н. Дарафейчык*
Камп'ютэрны набор і вёрстка *Д. Андрэеў*